**УДК 1(476)(091)+141.30**

# ВЫТОКІ І ШЛЯХІ РЭЦЭПЦЫІ ІДЭЙ НЕАТАМІЗМУ НА БЕЛАРУСКАЙ ГЕАКУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ

***Г.І. КЛІМОВІЧ***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Выконваецца эксплікацыя і аналіз вытокаў і шляхоў рэцэпцыі ідэй неатамізму на беларускай геакультурнай прасторы. На прыкладзе фактапагічнага матэрыялу аўтар прасочвае асноўныя крыніцы запазычання праграмных установак неатамізму ў беларускую рэлігійна-філасофскую думку. Звяртаецца ўвага на тое, што працэс рэцэпцыі ідэй неатамізму на тэрыторыі Беларусі меў як афіцыйныя (энцыклікі Ватыкана), так і неафіцыйныя крыніцы. Шляхі яго распаўсюджвання былі даволі рознымі, яны закранулі сістэму адукацыі, навуковыя даследаванні; прыклады звароту да філасофскай спадчыны Фамы Аквінскага назіраюцца ў мастацкай літаратуры, шматлікіх артыкулах у часопісах, якія выходзілі пад патранатам каталіцкай царквы на беларускіх тэрыторыях. Пранікненне тамісцкіх установак ажыццяўлялася як праз творчасць асобных мысліцеляў, так і праз дзейнасць рэлігійных таварыстваў.*

Неатамізм з’яўляецца адным з найбольш уплывовых кірункаў еўрапейскай рэлігійнай філасофіі. Узнікшы пад уплывам энцыклікі Льва XIII «Aeterni Patris», ён быў адаптаваны праз творчасць шматлікіх рэлігійных дзеячоў, сярод якіх былі і беларускія прадстаўнікі. Ідэі неатамізму з’уляюцца асноватворнымі для шэрагу айчынных мысліцеляў: Фабіяна Абрантовіча, Адама Станкевіча, Яна Тарасевіча, Язэпа Рэшаця, Чэслава Сіповіча, Льва Гарошкі, Тамаша Падзявы і іншых. У сувязі з гэтым навуковы інтарэс прадстаўляе пытанне: “Якім чынам ідэі неатамізму з’явіліся на Беларусі і якімі былі шляхі іх рэцэпцыі ў беларускай рэлігійна-філасофскай думцы?” З гэтага вынікае мэта дадзенай працы – эксплікацыя асноўных крыніц рэцэпцыі і шляхоў распаўсюджвання ідэй неатамізму на беларускай геакультурнай прасторы.

**Асноўная частка.** Галоўны канал трансляцыі ідэй неатамізму, на які арыентаваліся беларускія каталіцкія дзеячы, – пасланні Ватыкана (энцыклікі). “Aeterni patris” (1879) Льва XIII і “Pascendi” (1907) Пія X з’явіліся афіцыйнымі крыніцамі, якія паклалі пачатак развіццю неатамізму. Энцыкліка Льва XIII пагаджаецца з дынамізмам развіцця палітычнай, культурнай, эканамічнай і сацыяльнай сферы Еўропы XIX стагоддзя і заклікае каталіцкі свет карыстацца дасягненнямі навукі. У той жа час гэты папа будуе рэфлексію згодна з прынцыпамі філасофіі Фамы Аквінскага, несупынна паўтараючы пра неабходнасць захавання ў чыстым выглядзе яго вучэння. Энцыкліка “Pascendi” Пія X, пераемніка Льва III, была накіраваная ў першую чаргу супраць мадэрнізму. Адзначаецца, што погляды каталіцкіх мысліцеляў павінны супадаць з духам і ідэямі філасофіі Фамы Аквінскага.

Неабходна таксама ўзгадаць энцыкліку Льва XIII “Rerum Novarum” (1891) – адкрыты ліст да ўсіх епіскапаў рымска-каталіцкай царквы, які звяртае ўвагу на становішча працоўнага класа. Дадзены дакумент стаў падставовым для хрысціянскай дэмакратыі. У энцыкліцы разглядаюцца ўзаемаадносіны паміж урадам, бізнесам, працоўнымі і касцёлам. Папа падтрымаў ідэю аб стварэнні працоўных прафесійных саюзаў, адмаўляў сацыялістычную філасофію і прызнаваў правы прыватнай уласнасці. Дагэтуль дадзеная энцыкліка, нягледзячы на ўжо доўгі тэрмін існавання, мае аўтарытэт і значэнне для сацыяльнай палітыкі каталіцкай царквы і хрысціянскай дэмакратыі.

Для пасляваеннага перыяду важнае значэнне мелі наступныя энцыклікі, якія паўплывалі на рух каталіцкай інтэлектуальнай думкі: “Humani generis” (1950) папы Пія XII і “Populorum progressio” (1966) папы Паўла VI. “Humani generis” Пія XII, прысвечаная разгляду меркаванняў, якія, на думку папы, падрываюць аўтарытэт Царквы. Сярод іх ён адзначае бергсаніянства, тэярдызм, экзістэнцыялізм, галоўнай ідэяй якіх становіцца прыярытэт часовага над абсалютным, або нават адсутнасць абсалютнага. “Populorum progressio” (1966) папы Паўла VI выйшла адразу пасля Другога Ватыканскага Сабора і адзначае цесную сувязь з ім.

Адзін з першых беларускіх прадстаўнікоў, які арыентаваўся на ідэі неатамізму, быў Фабіян Абрантовіч. На пачатку XX стагоддзя ён апублікаваў дзве працы: «Ньюман і мадэрнізм», прысвечаную філасофскім і рэлігійным поглядам Джона Генры Ньюмана [1], а таксама «Касцёл і навука» [2], якая па сутнасці з’яўляецца пераасэнсаваннем ідэй, маніфеставаных раней у энцыкліцы Льва XIII «Aeterni Patris». Трэба адзначыць, што абедзве працы напісаны пад уплывам тагачасных інтэлектуальных павеваў, а менавіта ўжо адзначанай вышэй энцыклікі Льва XIII і барацьбы папы Пія X супраць вучэнняў мадэрнізму. У сваіх поглядах Фабіян Абрантовіч быў палеатамістам, у яго творах прасочваецца ўплыў афіцыйнага пункту гледжання Ватыкана, у той жа час адсутнічаюць вострая крытыка і аналіз вучэння мадэрнізму.

Праца “Ньюман і мадэрнізм” прысвечаная ўсебаковаму агляду і аналізу жыцця і творчасці каталіцкага багаслова, філосафа, асветніка і літаратара XIX стагоддзя Джона Генры Ньюмана. Яго творчасць вызначыла шлях развіцця новай тэалогіі, якая ў будучыні фундзіравала падмурак сучаснага каталіцызму.

Фабіян Абрантовіч параўноўвае яго па моцы ўздзеяння на розум каталіцкіх вернікаў з Фамой Аквінскім [1, с. 3]. Праблемнае поле працы ахоплівае жыццёвы шлях кардынала, яго творчую спадчыну, а таксама аналіз карэляцыі асноўных прынцыпаў і ідэйных установак Ньюмана з катэгорыяй мадэрнізму. Праца Ф. Абантовіча складаецца з 4 частак: 1. “Кароткі жыццярыс”; 2. “Вяршынства сумлення”; 3. “Эвалюцыя дагматаў”; 4. “Параўнанне з мадэрнізмам”.

У першай частцы прадстаўлены асноўныя вехі жыцця Джона Генры Ньюмана, а таксама гісторыя яго пераходу з пратэстантызму ў каталіцызм. У другой частцы аналізуецца асноўнае паняцце яго філасофскай сістэмы – прынцып вяршынства сумлення. У трэцяй частцы прадстаўлена развіццё ідэі эвалюцыі ў творчасці кардынала Ньюмана і звязаных з ёй прынцыпаў “захавання тыпу”, “пераемнасці прынцыпаў”, “здольнасці да асіміляцыі”, “лагічных следстваў”, “аб’яўлення будучыні”, “захавання здабыткаў мінулага”, “трываласці”. Апошняя частка прысвечаная аналізу ўздзеяння прынцыпаў мадэрнізму на творчасць Джона Генры Ньюмана. Фабіян Абрантовіч разам з іншымі прадстаўнікамі каталіцкай царквы прыходзіць да высновы, што кардынал Ньюман мадэрністам не быў і ўплывам мадэрнісцкіх тэорый не падвяргаўся.

Другая праца Ф. Абрантовіча – «Касцёл і навука» прысвечаная цэнтральнаму пытанню хрысціянскай філасофіі – праблеме карэляцыі навукі і рэлігіі. Яна прасякнутая духам энцыклікі Льва XIII “Aeterni Patris”. Так, пагаджаючыся з выключнай роляй розуму ў чалавечым існаванні, Фабіян Абрантовіч піша: “Паглядзім, якое ёсць на самой справе палажэнне і адносіны касцёла да навукі. Як казалі раней, касцёл сустракаецца ва ўсіх ступенях даследавання з навукай, апіраецца на розум, карыстаецца ім і на яго фундаменце падымае надбудову Аб’яўлення” [2, с. 6].

Энцыцкліка “Aeterni Patris” пазіцыянуе наступны погляд на філасофію і святло чалавечага розуму: “Не трэба ігнараваць, або памяншаць значэнне натуральных дапаможных сродкаў, у якіх, дзякуючы дабрадзейству Боскай мудрасці, эфектыўна і ў адпаведнасці ўсім распараджэнням род чалавечы ёсць багата абсталяваны. Сярод гэтых сродкаў найважнейшае месца займае адпаведнае выкарыстанне філасофіі. Бо недарэмна Бог адараваў людскую душу святлом розуму. Дадзенае святло веры не змяншае і не нішчыць эфектыўнасці і моцы чалавечага інтэлекту, а наадварот – яго ўдасканльвае; павышаючы яго сілы, робіць яго здольным да разумення справаў Боскіх” [3]. І далей: “Філасофія, калі толькі належна выкарыстоўваецца вучонымі, здольная нейкім чынам зраўнаваць і пракласці шлях да сапраўднай веры і як мага лепей прыстасаваць розум сваіх вучняў да прыняцця Адкрыцця. Менавіта з гэтай нагоды была названа старажытнымі аўтарамі "вучэннем, якое вядзе да веры хрысьціянскай", або "ўвядзеннем у веру і яе дапамогай", або яшчэ па-іншаму, але не менш слушна, а менавіта "настаўнікам Евангелля"” [3].

Такім чынам, назіраецца падабенства ідэй “Aeterni Patris” і Ф. Абрантовіча ў пункце разгляду розуму ў якасці натуральнага падмурка веры.

У працы «Касцёл і навука» Ф. Абрантовіч закранае адзін з галоўных вектараў праблемнага поля карэляцыі навукі і рэлігіі – адносіны паміж навукай і аб’яўленнем. Аўтар выкарыстоўвае тэзіс, які з’яўляецца традыцыйным поглядам на дадзенае пытанне ў межах філасофіі як Фамы Аквінскага, так потым і неатамізму – не супрацьпастаўленне ісцін навукі і веры, але суаднясенне іх да розных сфер рэчаіснасці – натуральнай і звышнатуральнай. Змест дадзенай праблематыкі ў Фабіяна Абрантовіча: “Паводле навукі Касцёла, Аб’яўленне не супярэчыць розуму, але знаходзіцца над ім, не так, як быццам розум гэтых ісцін дасягнуць не мог, але так, што пазнанне асноў Аб’яўлення мае сваю крыніцу таксама ў розуме, у вопыце” [2, с. 8].

Адначасова Ф. Абрантовіч падкрэслівае, што навука не мае магчымасці абвяргаць або падтрымліваць праўды Аб’яўлення: “Калі б адмовіла, стала б сама з сабой у супярэчнасці, бо перш чым штосьці адмовіць, трэба найперш сцвердзіць, што гэтага няма, або гэта адбываецца іншым чынам. Між тым, таму што перавышае і пераўзыходзіць поле навукі, то не можа адмаўляць, а можа даць толькі адзін разумны адказ: не ведаю” [2, с. 8].

Трэба адзначыць, што Фабіян Абрантовіч закранае тэматыку ўзаемаадносін навукі і рэлігіі, якая будзе адным з асноўных вектараў праблемнага поля неатамізму на працягу ўсяго XX стагоддзя і ў далейшым будзе ўспрынята іншымі беларускімі аўтарамі, у прыватнасці Львом Гарошкам. Праца фундзіраваная прынцыпамі вучэння Фамы Аквінскага, характэрнымі для неатамістаў. У якасці адной з характэрных рыс неатамізму адзначаецца трансцэндэнтная інтэнцыя чалавека, яго схільнасць да з’яднання з Абсалютам. У Фабіяна Абрантовіча мы знаходзім падобную думку: “Так у полі з’яў навука сцвярджае рэчаіснасць існавання Касцёла. У полі класіфікацыі разнастайнасці рэчаіснасці навука кажа толькі аб рэчаіснасці натуральнай (матэрыяльнай і духовай), Касцёл дадае яшчэ рэчаіснасць звышнатуральную, надпрыродную – Аб’яўленне. У полі прычын кожная навука падае найбліжэйшую, філазофія даходзіць да апошняй. Касцёл паказвае, што мэтай, альфай і амегай ёсць Бог” [2, с. 6].

Далей асноўныя ідэі неатамізму, нанава асэнсаваныя ў энцыкліцы Льва XIII, заўважаюўцца ў творчасці шматлікіх беларускіх каталіцкіх дзеячоў. Напрыклад, яскравае сведчанне арыентацыі на энцыкліку “Humani Generis” папы Пія XII – цыкл нарысаў “Бог” Ч. Сіповіча, надрукаваны ў часопісе “Зьніч” у 1950–1951 гады. Даследуючы асноватворную праблему неатамізму – рацыянальныя доказы існавання Абсалюту, аўтар звяртаецца, на яго думку, да негатыўных тэндэнцый тагачаснай філасофскай думкі, якія абясцэньваюць дасягненні тагачаснай філасофіі і перашкаджаюць далейшаму яе развіццю. Сярод іх ён

называе матэрыялізм, пантэізм, рацыяналізм, сэнсуалізм, агнастыцызм і суб’ектывізм [4, с. 5–6], некаторыя з якіх, як вядома, былі характэрнымі для сурова раскрытыкаваных у энцыкліцы плыняў бергсаніянства, экзістэнцыялізму атэістычнага напрамку і тэярдызму.

Папа Пій XII асуджае інтэлектуальныя праявы свайго часу, якія, на яго погляд, супярэчаць каталіцкім дагматам: “Калі хто будзе разглядаць стан спраў з пункту гледжання хрысціянскай паствы, то з лёгкасцю выявіць плыні, якіх прытрымліваюцца нямала вучоных мужоў. Іншыя неразумна і неабдумана мяркуюць, што эвалюцыя, існаванне якой цалкам не даказана нават у сферы натуральных навук, тлумачыць паходжанне ўсяго, і дёрзка падтрымліваюць маністычныя і пантэістычныя меркаванні, згодна з якімі свет знаходзіцца ў пастаяннай эвалюцыі. Камуністы ахвотна далучаюцца да іх меркаванняў, каб, пазбавіўшы чалавечую душу ідэі асабістага Бога, яны маглі паспяхова ахоўваць і прапагандаваць свой дыялектычны матэрыялізм. Гэтыя памылковыя догмы эвалюцыі, якія адмаўляюць усё трывалае, абсалютнае, нязменнае, праклалі шлях памылковай філасофіі, якая, супернічаючы з ідэалізмам, іманентызмам і прагматызмам, прыняла імя экзістэнцыялізму, паколькі клапоціцца толькі аб існаванні індывідуальных рэчаў, грэбуе разглядам іх нязменных існасцей. Існуе таксама нейкі гістарызм, які прыпісвае каштоўнасць толькі з’явам чалавечага жыцця, адмаўляе існаванне ўсялякага праўдзівага і адвечнага абсалютнага закону як на ўзроўні філасофскіх спекуляцый, так і хрысціянскіх дагматаў” [5].

Такім чынам, у якасці асноўных крыніц знаёмства з неатамізмам мы можам вылучыць энцыклікі “Aeterni Patris” і “Humani Generis”. Але, як сведчаць факты, яны не былі адзінымі вытокамі. Маюцца прыклады знаёмства беларускіх аўтараў з творчасцю французскіх неатамістаў, напрыклад Ж. Марытэнам. Так, у часопісе “Хрысьціянская думка” быў надрукаваны артыкул, прысвечаны тагачасным тэндэнцыям развіцця філасофіі ў Францыі, дзе, між іншым, адзначаецца: “La Revue Catholique des Idees et des fait” прыносіць весці аб адраджэнні каталіцтва ў французскай літаратуры. Адраджэнне каталіцкіх імкненняў літаратуры ёсць пратэстам супраць пазітывізму Тана, ідэалізму Канта і дылетантызму Рэнана, якія ў сямідзесятых гадах мінулага стагоддзя панавалі над французскай думкай. Адраджэнне каталіцкіх ідэалаў было падрыхтавана віталістычнай філазофіяй, якая мела сваіх вялікіх прадстаўнікоў у асобах Бергсона, Блондэля і Барэсса. Гэтыя філёзафы сваімі поглядамі на інтуіцыю і веру прабілі сабе дарогу над матэрыялізмам у мастацтве. Каля 1910 года маладое каталіцкае пакаленне пачало выдаваць рад часопісаў … Імёны Жамма, Клодэля, Пэгі і Баўмана шырэй і шырэй пранікаюць у свеце. Цяперашняе маладое пакаленне дзеліцца на два кірункі: першы, правадыром якога з’яўляецца Х. Прамонд, хоча навязаць традыцыю каталіцкага французкага жыцця метадам інтуітыўным. Другі, з правадыром Марытэнам, ёсць сільна ваяўнічым і строга каталіцкім: ягоны зборнік "Rosean d’Or" робіць сільна апалагетычнае ўражанне” [6, с. 4].

Да шляхоў, якія садзейнічалі пранікненню ідэй неатамізму ў беларускую рэлігійна-філасофскую думку, трэба аднесці сродкі масавай інфармацыі, гамілетыку, навукова-папулярную літаратуру, мастацкую літаратуру, дзейнасць асветніцкага таварыства “Рунь”, навуковыя даследаванні.

Сярод сродкаў масавай інфармацыі трэба адзначыць выданне часопісаў “Божым шляхам”, “Зьніч”, “Хрысьціянская думка”, аўтары якіх перманентна звярталіся да праграмных установак неатамізму ў сваёй творчасці. Так, “Хрысьціянская думка” ўпершыню пазнаёміла чытачоў з творамі Я. Тарасевіча “Чалавек – шуканнік Бога”, “Зло і лякарства на яго”, “Беларусы ў святле праўды”, дала магчымасць шырокаму колу чытачоў пазнаёміцца з рэлігійна-філасофскімі нарысамі Ф. Абрантовіча “Бог”, “Чалавек”, казаннямі А. Станкевіча.

Вышэйзгаданыя аўтары знаходзіліся пад яскравым уплывам творчасці Фамы Аквінскага.

“Божым шляхам” і “Зьніч” выдаваліся ўжо за межамі Беларусі ў перыяд, калі шматлікія беларускія рэлігійныя дзеячы вымушаны былі пакінуць яе тэрыторыю. На старонках дадзеных часопісаў друкаваліся вядомыя беларускія аўтары Л. Гарошка, Ч. Сіповіч, П. Татарыновіч, творчая спадчына якіх прасягнутая ідэямі неатамізму.

Спасылкі на аўтарытэт вучэння Фамы Аквінскага маюцца і ў мастацкай літаратуры. Трэба ўзгадаць творчасць К. Сваяка (Стэповіча), а менавіта адзін з яго вершаў пад назвай «Цярністым шляхам»:

> “Тамаш сьвяты піша, што здабытак ад стравы,
> Ад рэчы, канечнай ў жыцьці,
> Ісьці мае бедным, а йначай – крывавы
> Зладзея назоў трэ нясьці” [7, с. 81].

Таксама Т. Падзява адзначае, што яго твор “Дзем’ян, або як людзі пачалі верыць у Бога” прысвечаны аднаму з рацыянальных доказаў існавання Абсалюту, якія вядомыя ў гісторыі філасофіі як “доказы існавання Бога Фамы Аквінскага” [8, с. 110].

Меўся шэраг даследаванняў, асноўным аб’ектам якіх была творчая спадчына Фамы Аквінскага. Дакладна зафіксавана, што А. Станкевіч працаваў над магістэрскай працай пад назвай «Doctrina S. Thomas Aquinatis de familia respektu habito moderne theorie liberae unionis” [9, с. 14]. Доктарская праца, прысвечаная кампаратывісцкаму аналізу творчай спадчыны Фамы Аквінскага і Мікалая Лоскага, дазволіла Ф. Абрантовічу атрымаць званне доктара філасофіі [10, с. 9–10].

Таксама трэба ўзгадаць гамілетыку – у першай палове XX стагоддзя казанні былі асноўным шляхам трансляцыі агульнакаталіцкіх ідэй і тэндэнцый на беларускую глебу. Дадзены спосаб распаўсюджвання ідэй неатамізму ўласцівы А. Станкевічу. У якасці прыкладаў можна ўзгадаць надрукаваныя на старонках ча-

сопіса “Хрысьціянская думка” артыкулы А. Станкевіча: “Božaje slova na V niadzieliu pa Troch Karaloch” [11]; “Božaje slova na VI niadzielu pa Siomusie” [12]; “Božaje Slova na III niadzielu Adventu” [13]; “Božaje slova na ŭračystaść św. Trojcy” [14]; “Liekcyja, Jevanhiellia i Navuka na V niadzieliu postu” [15].

Яшчэ адзін шлях рэцэпцыі праграмных установак неатамізму ў беларускай рэлігійна-філасофскай думцы – дзейнасць асветніцкіх таварыстваў (напрыклад, “Рунь”). Так, у адным з дакладаў, прачытаных на з’ездзе яго сябраў “Аб уплыве хрысціянства на беларускія абычаёвыя і пісаныя правы” (Я. Сурвіла), назіраюцца перманентныя спасылкі на тэксты Фамы Аквінскага [16].

Таксама трэба адзначыць, што асноўнымі ідэалагічнымі цэнтрамі развіцця ідэй неатамізму ў сістэме адукацыі былі Каталіцкі ўніверсітэт Фрэйбурга (Швейцарыя) і Інстытут вышэйшай філасофіі ў Лувэне [17, с. 25]. Менавіта тут стажыраваліся Я. Тарасевіч і Ф. Абрантовіч.

**Заключэнне.** Праведзенае даследаванне дазваляе канстатаваць, што ў якасці крыніц пранікнення ідэй неатамізму ў беларускую рэлігійна-філасофскую думку выступалі як папскія энцыклікі, так і працы французскіх неатамістаў. Працэс рэцэпцыі ідэй неатамізму на беларускай геакультурнай прасторы праходзіў наступнымі шляхамі: гамілетыка, дзейнасць асветніцкіх таварыстваў, сродкі масавай інфармацыі, сістэма адукацыі, навуковыя даследаванні і мастацкая літаратура.

ЛІТАРАТУРА

1. Abrantowicz, F. Newman a modernizm / F. Abrantowicz. – Wilno, 1907. – 29 s.
2. Abrantowicz, F. Kasciol a nawuka / F. Abrantowicz. – Wilno, 1912. – 32 s.
3. Leo XIII Aeterni Patris [Electronic resource]. – Mode of access: www.vatican.va/holyfather/leo_xiii/encyclicals/documents/hf_l-xiii_enc_ 04081879_ aeterni-patris_en.html. – Date of access: 14.08.2012.
4. Sipovič, Č. Boh / Č. Sipovič // Znič. – 1950. – № 2–3. – S. 5–6.
5. Пий XII Humani Generis / Una Voce Russia [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.unavoce.ru/library/humani_generis.html. – Дата доступа: 14.08.2012.
6. Z katalickaha žyccia ŭ Francyi // Chryścijanskaja Dumka. – 1928. – № 4. – S. 4–5.
7. Сваяк, К. Выбраныя творы / К. Сваяк. – Мінск: Кнігазбор, 2010. – 472 с.
8. Подзява, Ф. Демьян, или Как люди стали верить в Бога / Ф. Подзява. – Полоцк, 2003. – 111 с.
9. Конан, У. Ксёндз Адам Станкевіч і каталіцкае адраджэнне ў Беларусі / У. Конан. – Мінск: Про Хрысто, 2003. – 127 с.
10. Сіповіч, Ч. Айцец Архімандрыт Фабіян Абрантовіч (1884–1940) / Ч. Сіповіч // Божым шляхам. – 1957. – № 76–81. – С. 9–20.
11. Stankievič, A. Božaje slova na V niadzieliu pa Troch Karaloch / A. Stankievič // Chryścijanskaja Dumka. – 1933. – № 2. – S. 2.
12. Stankievič, A. Božaje slova na VI niadzielu pa Siomusie / A. Stankievič // Chryścijanskaja Dumka. – 1935. – № 7. – S. 2–3.
13. Stankievič, A. Božaje slova na III niadzielu Adventu / A. Stankievič // Chryścijanskaja Dumka. – 1933. – № 10. – S. 3–4.
14. Stankievič, A. Božaje slova na ŭračystaść św. Trojcy / A. Stankievič // Chryścijanskaja Dumka. – 1934. – № 5. – S. 2–3.
15. Stankievič, A. Liekcyja, Jevanhiellia i Navuka na V niadzieliu postu / A. Stankievič // Chryścijanskaja Dumka. – 1929. – № 5. – S. 3.
16. Сурвіла, Я. Аб уплыве хрысціянства на беларускія абычаёвыя і пісаныя правы / Я. Сурвіла // Божым шляхам. – 1953. – № 56. – С. 15–20.
17. Кирьянов, Д.В. Томистская философия ХХ века / Д.В. Кирьянов. – СПб.: Алатейя, 2009. – 169 с.

*Паступіў 15.05.2015*

**THE SOURCES AND WAYS OF THE NEOTHOMISTIC IDEAS RECEPTION IN BELARUSIAN GEOCULTURAL SPACE**

***G. KLIMOVICH***

*The main aim of the article is to explicate and analyze beginnings and ways of the Neo-thomistic ideas reception on Belarusian geocultural area. On the base of factual material the author traces the main sources of Thomism ideas borrowing program to the Belarusian religious and philosophical thought. The process of neo-thomistic ideas reception in Belarus had both formal (Vatican encyclicals) and unofficial sources. Ways of its spread were different, they raised the educational system, scientific research. Examples refer to the philosophical heritage of Thomas Aquinas observed in the literature, numerous articles in journals that appeared as the voice of the Catholic Church in the Belarusian areas. Penetration of Neo-thomistic systems was carried out both through individual creative thinkers, and through the activities of religious communities.*